**Ігнаценка, Т.** Чакалі, верылі... / Т. Ігнаценка // Сцяг Перамогі (Лёзна). — 2020. — 14 лют. — С. 2.

**ЧАКАЛІ, ВЕРЫЛІ...**



Тыя паўтара года, якія сын служыў у Афганістане, для маці З. В. Жураўлёвай сталі нялёгкім выпрабаваннем. Яе Валодзя, учарашні хлопчык, тоненькі, светлавалосы, ледзь стаўшы салдатам, трапіў адразу ў палаючую кропку баявых дзеянняў. Стрымліваючы хваляванне, Зоя Васільеўна дзеліцца ўспамінамі:

– На Лёзненшчыне я з 1966 года. У саўгасе «Адаменкі» працавала аграномам, брыгадзірам у паляводстве. Дзеці, Надзя і Валодзя, былі яшчэ малыя, калі разышліся з першым мужам. Потым сустрэла Івана Васільевіча Скрыпялёва, ён стаў апорай для сям'і. Хутка 40 гадоў, як мы разам, дзелім папалам усё, што выпадае ў жыцці. Вось і ў тое ліхалецце яго падтрымка давала мне сілы.

Уладзімір з дзяцінства цікавіўся тэхнікай. Заўсёды быў побач з айчымам, саўгасным трактарыстам. Дапамагаў рамантаваць, калі-нікалі дазвалялася і паруліць. Таму пасля лёзненскай СШ № 2 хлопец скончыў аўташколу ў Віцебску і пачаў працаваць механізатарам у сваім саўгасе. У 1986 годзе прызвалі ў войска.

– Толькі адзначылі яго дзень нараджэння, 8 кастрычніка, а 10-га атрымаў павестку, – расказвае маці. – Мае спадзяванні, што будзе служыць дзе-небудзь у Саюзе, скончыліся, калі знаёмы ў Віцебску папярэдзіў: менавіта гэту групу плануюць адправіць у Афганістан. Сэрца маё зайшлося, бо ведала ўжо пра тыя цынкавыя труны, якія прыходзілі адтуль. У тым ліку і ў наш раён. Летам загінуў Саша Бельчыкаў з Альхавіка.

У вучэбцы Уладзімір быў у горадзе Тэрмез што на самай мяжы Таджыкістана з Афганістанам. Прайшоў паскораныя курсы вадзіцеляў БТР. Родныя збіраліся да яго на прысягу, але ў лісце ён паведаміў, каб не ехалі, таму што могуць не сустрэцца, на граніцы пастаянныя перамяшчэнні. А 5 лютага адправілі ўжо на афганскую тэрыторыю ў горад Кандагар, дзе і прыйшлося служыць усе паўтара года. Лістоў ад яго доўга не было. Сям'я жыла звесткамі з газет і тэлебачання.

– Не было той хвіліны, каб не думала пра сыночка, – дзеліцца жанчына. – Прыйду вечарам з работы і хутчэй уключаю тэлевізар: якія там сёння навіны. Ведала, што і так нялёгка яму. Мясцовасць і клімат не такія, як у нас. А звесткі проста пужалі – вядома, вайна. Прыязджала з Крынак да нас такая ж маці, пыталася, можа мой што-небудзь піша. Разам паплакалі.

Нарэшце пачаўся вывад савецкіх войск з Афганістана. Але трывога не знікала, бо шмат яшчэ гінула нашых хлопцаў. Дачка і муж супакойвалі Зою Васільеўну, казалі, што вернецца іх Валодзя, толькі трэба верыць у гэта. Маліла Бога, каб ўратаваў, збярог. І сэрца падказвала, што так і будзе. Уладзімір Жураўлёў атрымаў лёгкае раненне і выйшаў з вайны жывым 5 жніўня 1988

года. Апошнія месяцы праходзіў службу ў Грозным. Аб тых ваенных дарогах Уладзімір Геннадзьевіч успамінае:

– Пад'ём звычайна ў чатыры гадзіны раніцы. Мы правяралі ўчастак дарогі на наяўнасць мін. Сапёры ішлі спераду, я на БТР за імі. Потым ужо рухаліся калоны з боепрыпасамі, правіянтам, ГЗМ. На прыпыначным пункце можна было выйсці з машыны, адпачыць. Менавіта там папалі пад мінамётны абстрэл, што здаралася нярэдка. Атрымалі раненне двое сапёраў і я. Добра, што раны былі няцяжкія, таму давёў БТР да базы.

За перыяд службы У. Г. Жураўлёў атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За баявыя заслугі» і «За адзнаку ў воінскай службе».

Маці не забыць, як сустрэла свайго салдата, стоячы каля вясковага магазіна. Кажа, гляджу і вачам не веру: мой Валодзя ідзе, толькі нейкі іншы, не той хлопчык, як раней. Радасці не было межаў ад таго, што ўцалеў, вярнуўся да яе сын.

Далей лёс воіна-інтэрнацыяналіста склаўся ўдала. Працаваў вадзіцелем у родным саўгасе. Затым ажаніўся, і маладыя пераехалі ў Віцебск, дзе нарадзілася дачушка Елізавета. Так атрымалася, што разышліся, але засталіся ў іх добрыя адносіны. Цяпер новая сям'я Уладзіміра – гэта Ірына і яе дачка Насця. Шмат гадоў У. Г. Жураўлёў аддаў службе ў сістэме МУС, выйшаў на заслужаны адпачынак у званні маёра. За добрасумленную службу таксама ёсць узнагароды.

Ён прымае актыўны ўдзел у выхаванні падрастаючага пакалення. У Адаменкі да родных наведваецца часта. І адпачыць ад гораду, і дапамагчы на бацькоўскім прысядзібным участку, дзе вырошчваюць разам гародніну на ўсю вялікую сям'ю.

– Тут жа ў Адаменках жыве і працуе бухгалтарам мая ўнучка Насця, дачка Надзеі, – кажа Зоя Васільеўна. – Дзеткі штодзень бываюць у нас у гасцях. Так што я ўжо прабабка пецярых праўнукаў. Адна з іх – унучка Уладзіміра Верачка. Радуюся, што жывём зараз у міры, што адчуваю ўвагу і клопат блізкіх, стараюся быць ім патрэбнай.

**Таццяна ІГНАЦЕНКА**